Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 261 (330) СЕРАДА 13 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАКОП

Дваццаць год прайшло з таго дня, калі пад імклівым націскам геройскай Чырвонай Арміі палі на Перакопе врангелеўскія цвярдыні. Пройдуць яшчэ дзесяцігоддзі, яны сальюцца ў вякі—і ў вяках не згасне слава гістарычных баёў, прынёсшых поўную перамогу совецкай краіне.

Незабываемыя карціны начнога пераходу па топкаму марскому дну, пад пагрозай абстрэлу з аднаго боку, пад пагрозай прылыву — з другога. Незабываемыя карціны штурму ўмацаванняў, калі пад варожым агнём героі-байцы ішлі ўперад, — і нішто не магло спыніць іх, устрашыць, зламіць. Перад рэвалюцыйным пролетарскім напорам бяссільнымі аказаліся гарматы, кулямёты белагвардзейцаў і замежных інтэрвентаў.

Вялікія, дарагія ўсёй нашай краіне імёны звязаны з гэтымі гістарычнымі баямі. Ленін сачыў з Масквы за ўсімі падрабязнасцямі аперацый і даваў свае ўказанні. Таварыш Сталін выпрацаваў стратэгічны план. Лозунг таварыша Сталіна «Смерць Врангелю!» натхніў краіну, запаліў байцоў страсцю рашучага бою і няспынным воляй да перамогі. Слаўны пролетарскі палкаводзец Міхаіл Васільевіч Фрунзе кіраваў ваеннымі дзеяннямі. Таварыш В. М. Молатаў у Данбасе забяспечваў моцны пролетарскі тыл. Таварыш М. І. Калінін вёў партыйна-палітычную работу на фронце. Таварышы К. Е. Варашылаў, С. М. Будзённы, С. К. Цімашэнка вялі ў бой геаічныя войскі.

Чорны барон Врангель быў апошняй стаўкай англа-французскіх інтэрвентаў. Усе надзеі міжнароднага імперыялізма былі звязаны з атаманам разбойніцкага гнязда ў Крыме.

Англійскія і французскія інжынеры будавалі на перашыйку Крыма ўмацаванні па апошняму слову ваеннай тэхнікі. Гэтыя ўмацаванні былі аб'яўлены непрыступнымі. Французскі флот абараняў подступы да іх. На баку інтэрвентаў былі тэхніка, ваенны вопыт, ваенная падрыхтоўка.

Але апраўдаліся на прыкладзе перакопскіх баёў словы: тэхніка мёртва без людзей. За тэхнікай замежных інтэрвентаў былі людзі мёртвай справы, асуджаныя гісторыяй на пагібель класы. На баку большэвікоў былі класы, поўныя жыцця, поўныя ўпэўненасці ў сваёй перамозе. Саюз рабочага класа і сялянства, кіруемы партыяй Леніна — Сталіна, апракінуў рукою белагвардзейшчыну сумесна з англа-французскімі імперыялістамі.

Разгромам врангелеўшчыны заканчваецца перыяд інтэрвенцыі. Працоўныя ўсіх краін віталі гэтую бліскучую перамогу совецкага народа. Геаічныя баі пад Перакопам адкрылі перад совецкім народам шырокі шлях таспадарчага адраджэння краіны, социялістычнага будаўніцтва.

«Вайна замежных інтэрвентаў і расійскіх белагвардзейцаў супроць Советаў скончылася перамогай Советаў.

Совецкая рэспубліка адстаяла сваю дзяржаўную незалежнасць, свае свабоднае існаванне.

Гэта быў канец замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны.

Гэта была гістарычная перамога Совецкай улады» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»).

Капіталістычны свет вымушан быў адступіць у злосным бяссіллі. Разбуралася надзея на аднаўленне ўлады капіталістаў і памешчыкаў. На заклік большэвіцкай партыі совецкая краіна ўзялася за кіпучую творчую працу, за будаўніцтва новага жыцця, аснованага на социялістычных пачатках.

Чырвоная Армія ў баях ля Перакопа паказала высокі большэвіцкі дух, палкую адданасць сваёй радзіме. Расказы аб геаічных подзвігах у гэтых баях з'яўляюцца магутным сродкам воінскага выхавання чырвонаармейскіх пакаленняў. Малады баец даведваецца, як змагаліся яго бацькі за радзіму, якія перашкоды яны пераадолелі. Гісторыя перакопскага штурму — гэта залаты фонд геаічных большэвіцкіх традыцый Чырвонай Арміі.

Баявы дух Перакопа жыве ў нашай Чырвонай Арміі! А за наступныя дваццаць год социялістычнага будаўніцтва мы стварылі і магутную ваенную тэхніку. Ад разгрому лініі барона Врангеля да разгрому ліній барона Манергейма — такі шлях Чырвонай Арміі. Ад «непрыступнага» Турэцкага вала на Перакопскім перашыйку да «непрыступных» ўмацаванняў на Карэльскім перашыйку... Моцныя сваім воінскім духам, сваімі магутнымі ваеннымі сродкамі, Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот сталі надзейным аплотам мірнай працы народаў СССР, верным стражам заваёў Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі.

З любоўю і гордасцю совецкі народ на ваенных парадах 7 лістапада сустрэў часці Чырвонай Арміі. У жалезных радах ішлі і героі старэйшага пакалення, удзельнікі слаўных баёў, і доблесныя байцы маладых пакаленняў, ужо паспеўшых пакрыць славай баявыя сцягі ля возера Хасан, і на рацэ Халхін-Гол, і ў баях з белафінамі. Як дваццаць год назад, так і зараз уся краіна ахоплена адным імкненнем, адной воляй — сустрэць ворагаў, якія асмеляцца-б парушыць мір социялістычнай працы.

Дваццаць год назад Чырвоная Армія, яшчэ зусім маладая, яшчэ толькі накапліўшая баявы вопыт, выкінула з совецкай зямлі белагвардзейцаў і інтэрвентаў і заваявала для совецкага народа праві наладжваць сваё жыццё па-свойму, па-новаму. Нетрываным было яшчэ тады становішча маладой совецкай дзяржавы, у капіталістычным акружэнні спелі планы новых набегаў, новых авантур.

Ні на мінуту не забывала і не забывае партыя Леніна — Сталіна аб гэтым капіталістычным акружэнні. Бесперапынна выкоўвала яна сваё аружжа — Чырвоную Армію, Ваенна-Марскі Флот, абаронную прамысловасць. З асобай увагай выхоўвалі партыя і Совецкі ўрад кадры сталінскіх сокалаў, стварылі магутную авіяцыю. Чырвоная Армія расквітае цяпер мужнай і вынослівай, выдатна ўзброенай пяхотай, велізарнымі механізаванымі сродкамі, грознымі артылерыйскімі гарматамі, танкамі, бранявікамі.

Праз дваццаць год пасля Перакопа Совецкі Саюз — гэта фактычна адзіная вялікая дзяржава, якая стаіць зне вайны, ахваціўшай амаль увесь свет, і мае магчымасць, апіраючыся на сваю сілу, захоўваць нейтралітэт. Праз дваццаць год пасля Перакопа магутны Совецкі Саюз мірным шляхам расшырыў сваю тэрыторыю, Чырвоная Армія прынесла вызваленне брацкім народам, якія таміліся ў палоне ў памешчыкаў і капіталістаў. Гэтым сваім міжнародным становішчам, гэтымі поспехамі сваёй знешняй і ўнутранай палітыкі Совецкі Саюз абавязан ленінска-сталінскаму кіраўніцтву большэвіцкай партыі. Пад лозунгамі нашай партыі самаадданна біліся абаронцы социялістычнай радзімы, у іх ліку і тыя героі, якія аддалі сваё жыццё за радзіму ля перакопскіх і чангарскіх умацаванняў. Іх памяць асвечана назаўсёды славянай для совецкага народа!

«Праўда», 11 лістапада.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР *)

АБ ДНІ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР АД МАЛДАЎСКАЙ ССР, АКЕРМАНСКАЙ і ЧЭРНАВІЦКАЙ АБЛАСЦЕЙ УКРАІНСКАЙ ССР, АД ЛІТОЎСКАЙ ССР, ЛАТВІЙСКАЙ ССР І ЭСТОНСКАЙ ССР.

1. Назначыць выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Малдаўскай ССР, Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР, ад Літоўскай ССР, Латвійскай ССР і Эстонскай ССР на 12 студзеня 1941 года.

2. Аб'явіць пачатак выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Совет СССР ад названых рэспублік і абласцей з 12 лістапада 1940 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 11 лістапада 1940 года.

***) Ад рэдакцыі. У сувязі з недакладнасцю пры надрукаванні Указа ва ўчарашнім нумары нашай газеты—друкуецца ў другі раз.**

Прыбыццё ў Берлін Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). 11 лістапада ўвечары Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш Молатаў В. М. праследаваў праз пагранічную германскую станцыю Малкіня, дзе яго сустрэлі і віталі прадстаўнікі германскага ўрада ў асобе начальніка пратакольнага аддзела міністэрства замежных спраў Дэрнберга, начальніка штаба сувязі Чэнерала Гесса-Штэнгера і капітана флота Штэфазіуса.

12 лістапада ў 11 гадзін на берлінскаму часу таварыш В. М. Молатаў прыбыў у Берлін. Разам з таварышам Молатавым прыбыў паўпрэд СССР у Германіі тав. Шкварцаў, які выязджаў для сустрэчы таварыша Молатава на совецка-германскую граніцу.

У Берліне таварышу Молатаву германскімі ўладамі была наладжана ўрачыстая сустрэча.

Яшчэ задоўга да прыходу поезда на Ангальскім вакзале сабраліся прадстаўнікі германскіх урадавых органаў, ваеннага камандавання, дыпламатычнага корпуса ў Берліне, супрацоўнікі совецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва і гандлёвага прадстаўніцтва ў Германіі, замежныя і нямецкія журналісты. Перон вакзала быў упрыгожан зеленню і кветкамі. Ля выхаду з будынка вакзала былі вывешаны совецкі і германскі дзяржаўныя флагі. На прылягаючых да вакзала вуліцах задоўга да прыходу поезда сабралася вялікая колькасць народа.

Роўна ў 11 гадзін поезд падышоў да перона вакзала. Старшыню Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава з германскага боку сустракалі: міністр замежных спраў Германіі п. фон Рыбентроп, кіраўнік вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі генерал-фельдмаршал Кейтэль, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік германскай паліцыі Гімлер, начальнік аддзела друку германскага ўрада доктар Дзітрых, статс-сакратары міністэрства замежных спраў фон Вейцзекер, Боле, Кеплер, пасол Рытэр, камендант горада Берліна генерал-лейтэнант Зейферт, бургамістр Берліна п. Штэег і іншыя.

Пасля абмену прывітаннямі паміж таварышам Молатавым і п. фон Рыбентропам, таварыш Молатаў і п. фон Рыбентроп прайшлі ўздоўж фронта выстраенай ля вакзала роты пачотнай варты. Затым таварыш Молатаў у суправаджэнні п. фон Рыбентропа накіраваўся ў замак Бельвю.

Увесь германскі цэнтральны і правінцыяльны друк аднадушна ацэньвае прыбыццё таварыша Молатава ў Берлін, як факт першачарговага палітычнай важнасці.

Гутарка паміж п. фон Рыбентропам і таварышам В. М. Молатавым

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Сёння ў 12 гадзін дня па берлінскаму часу адбылася гутарка паміж міністрам замежных спраў Германіі п. фон Рыбентропам і Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышам В. М. Молатавым.

Гутарка паміж п. Гітлерам і таварышам В. М. Молатавым

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Сёння ў другой палове дня ў памяшканні новай імперскай канцылярыі адбылася гутарка паміж рэйхсканцлерам Германіі п. Гітлерам і Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышам В. М. Молатавым.

Гутарка адбылася ў прысутнасці германскага міністра замежных спраў п. фон Рыбентропа і намесніка Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. Г. Дэканозава.

Гутарка працягвалася звыш двух гадзін.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных

Кандыдаты 13-га камбіната

11 лістапада на 13-м тэкстыльным камбінаце адбыўся агульны сход рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Сход адкрыў сакратар партарганізацыі камбіната тав. Зенін.

Першы для прапановы бярэ слова стаханавец тав. Сінін.

— Я хачу, —гаворыць ён, — ад імені нашага калектыва вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета старшыню абласнога выканаўчага камітэта тав. **Мальцава.** Тав. Мальцаў з часоў грамадзянскай вайны працуе на адказных пастах, куды яго пасылала большэвіцкая партыя. Апошнія годы ён працаваў старшынёй Гомельскага аблвыканкома і быў узнагароджан урадам за поспехі вобласці ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Год назад партыя паслала тав. Мальцава да нас у Беластоцкую вобласць, і з таго часу ён працуе старшынёй аблвыканкома. Працоўныя выбралі яго дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Аб яго рабоце можна меркаваць па тым, чаго дасягнула наша вобласць за год совецкай улады. У гэтых вялікіх дасягненнях не малая заслуга тав. Мальцава.

Прысутныя на сходзе аднадушна галасуюць за выстаўленне кандыдатуры Сяргея Іванавіча Мальцава.

Наступным уносіць прапанову стаханавец тав. Мамчыц, які вылучае кандыдатуру лепшай старой работніцы камбіната, стаханаўкі-стрыгальшчыцы Мар'і Мартынаўны **Завістоўскай.**

— Я ведаю тав. Завістоўскую,— гаворыць тав. Мамчыц, — даўно, яна старэйшая работніца. Як толькі фабрыка стала совецкай, тав. Завістоўская актыўна ўключылася ў грамадскую работу, аддана стала працаваць на вытворчасці. Яна адна з самых прыкладных работніц.

Рабочыя аднадушна галасуюць за кандыдатуру тав. Завістоўскай.

Ткач-двухстаночнік тав. Кесцін вылучае кандыдатуру лепшага ткача-двухстаночніка, прафорга ткацкага цэха Ісака Абрамавіча **Гелера.** Ён характарызуе тав. Гелера як чэснага рабочага, які з 14 год працуе ткачом, ва ўсіх інцыдэнтах з фабрыкантамі абараняў інтарэсы рабочых. Зараз ён усе стараннi аддае рабоце, выконвае норму на 117 процантаў. Цэх, дзе ён прафоргам, заваяваў у спаборніцтве пераходны чырвоны сцяг.

Стаханаўка тав. Шэйн прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты лепшую стаханаўку-вінтаўтчыцу, брыгадзіра сельфактаршчыц Ольгу Фёдараўну **Карнатоўскую.** Яе брыгада з пяці чалавек абслугоўвае 920 верацён, выконвае месячную норму на 117—120 процантаў. У спаборніцтве з сваёй зменай брыгада Карнатоўскай вышла пераможцай.

Прысутныя на сходзе горача адобрылі кандыдатуру тав. Карнатоўскай.

***

Калектыў 20-й фабрыкі вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты гарадскога Совета лепшых рабочых-стаханаўцаў, актыўных удзельнікаў грамадскага жыцця, —старую работніцу-вінтаўтчыцу Соф'ю Іванаўну **Лукашук,** ткача-двухстаночніка, ініцыятара стаханаўскага руху ў цэху Ізраіля Майсеевіча **Фрэйдановіча,** а таксама начальніка 4-га аддзялення міліцыі Аляксея Пятровіча **Лебедзева.**

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ Ў АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Пастанова

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ВАЎКАВЫСКАЙ СЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 32 ПА ВЫБАРАХ У АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, акруговая камісія **пастанаўляе:**

На падставе арт. 73 Палажэння аб выбарах зарэгістрыраваць для балатыроўкі кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета па Ваўкавыскай сельскай выбарчай акрузе № 32 кандыдатуру Героя Совецкага Саюза **Сяргея Аляксандравіча Чэрных,** 1912 года нараджэння, члена ВКП(б), вылучанага агульным сходам калгаса імені Сталіна, Ізабелінскага сельсовета, на якім прысутнічала 150 чалавек, сходам вёскі Харужанты, на якім прысутнічала 52 чалавекі, і калектывам рабочых цагельнага завода № 5, дзе прысутнічала 65 чалавек.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах уключыць кандыдатуру тав. Чэрных С. А. у выбарчы бюлетэнь па Ваўкавыскай сельскай выбарчай акрузе № 32 у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Е. ФАДЗЕЕВА.

Намеснік старшыні А. АЙОН.

Сакратар З. ПРУС.

Члены: Б. ЖУРАЎКА, Д. ЛЕЎКОВІЧ, П. КАНДРАЧ, В. БЕКЕР.

Пастанова

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ГРОДНЕНСКАЙ УСХОДНЯЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 12 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных па Гродненскай Усходняй выбарчай акрузе № 12 вылучанага агульным сходам рабочых гродненскага велазавода, на якім прысутнічала 198 чалавек, і падтрыманага перадвыбарчым акруговым сходам Гродненскай Усходняй выбарчай акругі № 12, на якім прысутнічала 72 чалавекі, кандыдатуру тав. **Мальцава Сяргея Іванавіча,** 1895 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах кандыдатуру тав. Мальцава С. І. уключыць у выбарчы бюлетэнь па Гродненскай Усходняй выбарчай акрузе № 12.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі В. ЧЫСТОЎ.

Намеснік старшыні К. ЛЕБЕДЗЕВІЧ.

Сакратар М. ДАСЮЛЕВА.

Члены: Ш. ФІНК, В. ЛАПАЦІНА, В. ЛІСОЎСКАЯ, В. БАГАМОЛАЎ.

Пастанова

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ РОСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 36 ПА ВЫБАРАХ У АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, акруговая камісія **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістраваць для балатыроўкі кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета па Роскай выбарчай акрузе № 36 кандыдатуру старшыні калгаса «17 верасня», Гудзевіцкага сельсовета, **Леўсіка Аляксандра Іванавіча,** 1904 года нараджэння, беспартыйнага, вылучанага агульным сходам калгаса «17 верасня», на якім прысутнічала 65 чалавек, сходам вёскі Аляксандраўцы, на якім прысутнічала 37 чалавек, сходам вёскі Палаўкі, на якім прысутнічала 49 чалавек, сходам грамадзян мястэчка Волпы, на якім прысутнічала 162 чалавекі, сходам калгаснікаў калгаса «Ударнік», на якім прысутнічала 70 чалавек, і сходам грамадзян вуліцы 17 верасня мястэчка Рось, на якім прысутнічала 75 чалавек.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах уключыць кандыдатуру тав. Леўсіка А. І. у выбарчы бюлетэнь па Роскай выбарчай акрузе № 36 па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Д. ЗУГУРАЎ.

Намеснік старшыні Г. ВАЙЦЗХОЎСКІ.

Сакратар Е. ЛУКІЯНЧЫКАВА.

Член: С. ДЫНКОВІЧ, Н. МІХАЙЛОЎСКАЯ, І. КІБІН, П. УЛАНОВІЧ.

Пастанова

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЗАМБРАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 51 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах зарэгістраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных па Замбраўскай выбарчай акрузе № 51 вылучанага агульным сходам грамадзян вёскі Вандолкі-Бучкі, Длугабоцкага сельсовета, на якім прысутнічала 95 чалавек, кандыдатуру тав. **Кавалеўскага Эдварда Станіслававіча,** 1911 года нараджэння, беспартыйнага, працуючага на ўласнай гаспадарцы.

На падставе артыкула 78 Палажэння аб выбарах, кандыдатуру тав. Кавалеўскага Эдварда Станіслававіча ўключыць у выбарчы бюлетэнь па Замбраўскай выбарчай акрузе № 51.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі І. ФІШМАН.

Намеснік старшыні М. СЯМЕНАВА.

Сакратар І. КАЗЛОЎСКІ.

Члены: І. ОБУХАЎ, І. СІКОРСКІ, Я. КАЛІНОЎСКАЯ, І. ПЯТРОЎСКІ.

Упрыгожваюць памяшканне выбарчага ўчастка

ГРОДНА. (Ад нашага карэспандэнта). Выбарчы ўчастак у Гібуліцкім стаў цэнтрам агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў. Тут працуюць 18 агітатараў, якія растлумачваюць сялянам выбарчы закон, вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю, праводзяць гутаркі на міжнародныя тэмы.

Памяшканне выбарчага ўчастка поўнасцю абсталявана. Яно упрыгожана плакатамі, лозунгамі і партрэтамі правадыроў партыі і ўрада.

Г. ЛУПСЯКОЎ.

Партыйнае жыццё

Праверка выканання — важнейшае звяно партыйнай работы

Мала прыняць рашэнне, трэба арганізаваць яго выкананне. Там, дзе добра пастаўлена партыйная работа, праверка выканання займае ў рабоце партыйных арганізацый і асобных комуністаў значнае месца.

Скідэльскі райком КП(б)Б гэтай рабоце ўдзяляе значную ўвагу. Пытанні кантролю выканання часта абмяркоўваюцца на пасяджэннях райкома. З прынятых райкомам да 1 кастрычніка пастаноў праверана выкананне 35 рашэнняў.

За час пасля справаздачна-выбарчай кампаніі на пасяджэннях райкома 8 разоў слухаліся даклады асобных сакратароў пярвічных партарганізацый аб рабоце з кандыдатамі партыі, аб становішчы партыйнай гаспадаркі, аб выкананні рашэнняў справаздачна-выбарчых сходаў.

Аб рабоце з кандыдатамі партыі былі заслуханы даклады сакратароў пярвічных партарганізацый райвыканкома і аддзялення НКВД. Аб становішчы партыйнай гаспадаркі былі заслуханы даклады сакратароў пярвічнай партарганізацыі соўгаса Скідэль і партыйна-кандыдацкай групы райспажыўсаюза. Аб выкананні рашэння справаздачна-выбарчага схода слухаўся даклад сакратара пярвічнай партарганізацыі райкома КП(б)Б.

Праверана выкананне рашэння райкома аб рабоце комсамола і аб становішчы агітацыйна-масавай работы на лесазаводзе Азёры.

Работа па праверцы рашэнняў райкома праводзіцца работнікамі райкома КП(б)Б і партыйным актывам.

Але ёсць у гэтай справе недахопы. Райком не дабіўся такога становішча, каб поўнасцю і своечасова зжываць недахопы, ускрытыя ў час праверкі выканання рашэнняў. Неаднаразова займаўся райком пытаннямі палітмасавай работы ў Скідэльскай МТС. Аднак і на сённяшні дзень справы там не палепшыліся.

Недастаткова займаюцца праверкай выканання некаторыя пярвічныя партарганізацыі. Не ўсе сакратары партарганізацый дакладваюць на партыйных сходах аб выкананні рашэнняў папярэдніх партсходаў. З абмеркаваных на 10 партсходах пытанняў у пярвічнай партарганізацыі скуразавода, напрыклад, не праверялася 20 мерапрыемстваў.

У плане работы Скідэльскага райкома партыі прадугледжаны канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацненню работы па праверцы выканання. У прыватнасці, намечана праверыць выкананне раду пастаноў вышэйстаячых партыйных органаў, райкома партыі і пярвічных партарганізацый.

Дрэнна пастаўлена работа з праверкай выканання ў асобных пярвічных партарганізацыях Аўгустоўскага раёна. Разам з тым, зачастую правільна пастаўленыя пытанні не знаходзяць свайго адлюстравання ў прынятай пастанове з-за непісьменнага афармлення пратаколаў. Прынятыя пастановы ў некаторых партарганізацыях не паддаюцца не толькі праверцы выканання, але і нічога нікому не даюць, нікога нічым не абавязваюць, невядома ад каго неабходна патрабаваць выканання.

Пярвічная партарганізацыя лесазавода Ліпавец на партсходзе 1-га верасня слухала даклад сакратара арганізацыі тав. Таранка аб выкананні рашэнняў справаздачна-выбарчага схода і раённай партканферэнцыі па пытанню вывучэння гісторыі ВКП(б). Пытанне было пастаўлена пярвічнай партарганізацыяй зусім правільна, бо ў рабоце гэтай арганізацыі адсутнічала праверка выканання. Аднак гэтае абмеркаванне прынесла малую карысць з-за таго, што пастанова напісана бязграматна. Вось што сказана ў гэтай пастанове:

«Спачатку ўсе ўзяліся за вучобу, а потым асталілі гурток. Адносна работы клуба, то работа не перабудавалася, членскія ўзносы плоцяцца нерэгулярна, за што мелі папярэджанні. Размеркаванні абавязкаў сярод комуністаў: тав. Турчана, вазначана адказ-рэдактарам насценгазеты, рашылі зацвердзіць тав. Турчана на грамадскай рабоце адказ. рэдактар насценнай газеты «Новае жыццё».

Гэта-ж арганізацыя 19 ліпеня 1940 г. слухала даклад дырэктара завода аб разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва сярод рабочых. І зноў напісана амаль такая-ж пастанова:

«Хоц арганізацыі павінна забяспечыць учот соцспаборніцтва па цэхах. Праверыць работу па дзейнічаючых соцдагаворах да 25 ліпеня, ахапіць заключэннем соцдагавора ў індывідуальным, групавым парадку. Заўкому работа заключыўшых соцдагаворы паўсядзённа кіраваць і ўсямерна аказваць дапамогу па данаму пытанню, соцдагаворы павінны штомесячна правярацца».

Якую карысць могуць прынесці такія «пастановы»? Каму яны патрэбны?

Такое становішча ў некаторых арганізацыях Аўгустоўскага раёна атрымалася таму, што інструктары оргінструктарскага аддзела райкома нерэгулярна чытаюць пратаколы пярвічных арганізацый, мала цікавяцца работай комуністаў на месцах, не аказваюць дапамогі сакратарам пярвічных партарганізацый.

Праверка выканання — важнейшае звяно партыйнай работы. Гэтаму пытанню ўсе партыйныя арганізацыі, усе гаркомы і райкомы павінны ўдзяляць выключна вялікую ўвагу.

Е. Прусак.

Аб чым гаварылі комсамольцы

ВАЎКАВЫСК. (**Ад нашага карэспандэнта**). Адбыўся сход комсамольскай арганізацыі Ваўкавыскага раёна, прысвечаны вынікам XIV з'езда комсамола Беларусі.

У дакладзе сакратар райкома тав. Гуткіна вельмі мала спынілася на задачах арганізацыі, вынікаючых з рашэнняў з'езда.

Прайшло больш месяца пасля заканчэння выбараў комсамольскіх органаў раёна. За гэты час многія комсамольцы дабіліся новых поспехаў у рабоце і вучобе. Здавалася-б, што тав. Гуткіна магла расказаць аб гэтым сходу. Але выйшла адваротнае. Не сказаўшы ні слова аб новай рабоце комсамольскай арганізацыі, яна гаварыла аб фактах, якія ўжо ўпаміналіся ў справаздачным дакладзе.

Комсамолец тав. Каваленка адзначыў паслабленне комсамольскай дысцыпліны. 20 кастрычніка на 10 гадзін дня быў назначан раённы сход. Многім комсамольцам не паведамілі. Таму ў вызначаны час большасць комсамольцаў не з'явілася. А сама тав. Гуткіна прыйшла на сход тады, калі частка з'явіўшыхся разышлася дамоў

Тав. Карпей расказала аб тым, што важатыя піонерскіх атрадаў сярэдняй рускай школы старанна працуюць з піонерамі, але яны не атрымліваюць дапамогі ад школьнай камісіі райкома.

— Мы не заняліся,—гаворыць тав. Альперовіч, — наладжваннем работы сярод вясковай моладзі. У Мсцібаўскай комсамольскай арганізацыі 11 чалавек. Сярод іх большасць настаўнікаў, медработнікаў, аднак яны адмежаваліся ад несаюзнай моладзі, не вядуць з ёю ніякай работы.

Прысутныя на сходзе чакалі ад старшыні камісіі па ваенна-фізкультурнай рабоце тав. Маскаленка, што ён раскажа, як разгортваецца работа па падрыхтоўцы да зімовага сезону. Але дарэмна. Тав. Маскаленка заявіў, што нават не змог склікаць пасяджэння камісіі.

Выступаючыя тт. Якубовіч, Курмалёў, Якаўлеў, Егорачаў і Мядзведзева ўказвалі на неабходнасць палепшыць кіраўніцтва пярвічнымі арганізацыямі, наладзіць работу камісій райкома.

Сход аднадушна адобрыў рашэнні XIV з'езда комсамола Беларусі і абавязаў усіх комсамольцаў няўхільнаператвараць іх у жыццё.

Д. Казлоў.



Агітатары гродненскага скуразавода № 5 рыхтуюцца да заняткаў па Сталінскай Канстытуцыі.

На здымку: П. Д. Цвяткоў (злева) і О. В. Рутэнберг.

Фота А. Сапіра.

ГЕРАІЧНЫЯ СТАРОНКІ МІНУЛАГА

ЯК ПРАЦОЎНЫЯ БЫЛОЙ ПОЛЬШЧЫ СВЯТКАВАЛІ КАСТРЫЧНІК ВА ЎМОВАХ БУРЖУАЗНАГА ПРЫГНЁТУ

Ідэі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі глыбока пранікі ў сэрцы і розум перадавых рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У 1918 годзе рабочыя Варшавы, Лодзі, Дамбрава, выхаваныя Феліксам Дзержынскім, стварылі советы рабочых дэпутатаў, арганізавалі Чырвоную гвардыю ў Дамбраўскім вугальным басейне. Хаця буржуазіі сумесна з главарамі ППС удалося разбіць советы, разбраіць атрады Чырвонай гвардыі, падавіць рэвалюцыйны рух,—працоўныя штогодна святкавалі дзень 7 лістапада — дзень, калі зара свабоды заззяла для прыгнечаных усяго свету

Комуністы ў цяжкіх умовах падполля сістэматычна раз'яснялі працоўным, што адзіна верным шляхам да вызвалення з'яўляецца шлях Кастрычніка, шлях Леніна і Сталіна, што толькі пролетарская рэволюцыя, па прыкладу Кастрычніцкай, дасць рабочым фабрыкі, сялянам — зямлю, а прыгнечаным народам Польшчы — свабоду.

Штогодна напярэдадні гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі комуністы разгортвалі вялікую прапагандысцкую работу. У сотнях тысяч нелегальных лістовак, адозваў, у газетах, журналах і брашурах расказвалі аб Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, аб дасягненнях соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Падрыхтоўваліся спецыяльныя тэзісы для дакладчыкаў і прамоўцаў.

У кастрычніцкіх адозвах комуністы заклікалі да абароны СССР перад спробамі нападу з боку імперыялістычных дзяржаў і папулярызіравалі дасягненні планавай соцыялістычнай гаспадаркі.

У кастрычніцкім нумары органа КПЗБ «Да барацьбы» (на польскай мове) за 1931 г. указваецца на тое, што па ўсяму свету бушуе крызіс і беспрацоўе, а адначасова:

«СССР святкуе XIV гадавіну свайго існавання ва ўмовах пераможнага завяршэння трэцяга рашаючага года пяцігодкі пабудавання фундамента соцыялізма».

Артыкул указвае, што адзіны шлях да свабоды — гэта шлях Леніна і Сталіна, і заканчвае заклікам:

«Да барацьбы, пролетарыі! Наследуем-жа прыкладу СССР! Вышэй сцяг пролетарскай рэволюцыі—адзінага выхаду з крызісу, нястачы і тэрору».

Адозва Беластоцкага акруговага камітэта КПЗБ к 7 лістапада 1932 года, указваючы на дасягненні Совецкага Саюза, гаворыць:

«Гэтыя 15 год паказалі, што толькі перамога пролетарскай рэволюцыі можа забяспечыць працоўным лепшае жыццё. Рускі рабочы клас не ведае ні крызісу, ні беспрацоўя, ні нястачы».

Комуністы звязвалі прапаганду ідэі Кастрычніцкай рэволюцыі з мабілізацыяй мас на барацьбу за іх штодзённыя эканамічныя і палітычныя патрабаванні. У вышэй цытыраванай адозве Беластоцкага акруговага камітэта КПЗБ гаворыцца аб тым, што на фабрыках Фукса, Пачэбуцкага, Пінеса была сарвана заработная плата тэкстыльшчыкаў. Адозва заклікае рабочых дэманстраваць у дзень 7 лістапада таксама пад лозунгамі барацьбы за свае эканамічныя патрабаванні.

Комуністы заклікалі да масавых дэманстрацый і палітычных стачак у дзень 7 лістапада. Паліцыя рабіла ўсё, каб не дапусціць да гэтых выступленняў. На працягу кастрычніка праводзіліся павальныя вобыскі і арышты. Па вуліцах Варшавы раз'язджала праслаўтая чорная карэта, у якую паліцыя саджала масы арыштаваных людзей. Не гледзячы на гэта, заклік комуністаў да выступлення ў дзень 7 лістапада знайшоў шырокі водгук сярод працоўных. У Варшаве, Вільні, Беластоку, Львове, на тых прадпрыемствах, дзе моцны былі ўплывы комуністаў, дзе была праведзена адпаведная падрыхтоўка, адбыліся палітычныя забастоўкі.

Тав. Кавецкая (у мінулым ткачыха Шлесараўскай мануфактуры ў Озаркове) расказвае, што на іх фабрыцы ў дзень 7 лістапада штогодна адбываліся 10—15-мінутныя забастоўкі ў чэсць Кастрычніцкай рэволюцыі і Совецкага Саюза. У 1935 годзе, калі становішча рабочых асабліва пагоршылася, забастоўка працягвалася поўгадзіны. 2.800 рабочых сабраліся на фабрычным двары і зрабілі мітынг, на якім выступаў член комуністычнага саюза моладзі Польшчы тав. Тамашэўскі. На фабрыку прыбыў атрад паліцыі ў стальных шлемах, з вінтоўкамі. Паліцэйскія хацелі прарвацца праз сабраўшыхся і арыштаваць прамоўцу. Але рабочыя да гэтага не дапусцілі.

Асабліва глыбокай была традыцыя выступленняў у дзень 7 лістапада ў Варшаве. На працягу ўсяго кастрычніка адбываліся падрыхтоўчыя масоўкі на фабрыках. Як расказвае былы член комуністычнай арганізацыі ў Варшаве тав. Байшчак (зараз ён працуе на 15-м беластоцкім кафельным заводзе), масоўкі ў 1929 годзе адбываліся перад усімі важнейшымі фабрыкамі прамысловага квартала Варшава — Прага: перад фабрыкай амуніцыі «Поціск», аружэйным заводам «Збраеўня», фабрыкай авіяпрыбораў «Авія», фабрыкай гумавых вырабаў «Рыгавар» і іншымі. Усюды распаўсюджвалася комуністычная літаратура.

У дзень 7 лістапада звычайна пасля работы адбываліся цэнтральная варшаўская і паасобныя ўчастковыя дэманстрацыі.

У 1931 годзе ў дзень 7 лістапада, як піша орган КПП газета «Чырвоны сцяг» («Чэрвоны штандар»), пасля абеда на плошчы Керцэлего, на рагу вуліцы Лешна сабралося звыш 1.500 рабочых. Калі комуністычны прамоўца адкрыў мітынг, паліцыя, сабраная ў вялікай колькасці ля плошчы, атакавала рабочых. Не гледзячы на гэта, пасля разгону мітынга, рабочыя арганізавалі дэманстрацыю, якая рушылася ў напрамку да вуліцы Жалезнай. Гэта дэманстрацыя таксама была разагнана паліцыяй. Але дэманстранты зноў сабраліся і прасоўваліся па вуліцы Лешна да плошчы Вальносці.

У той-жа самы час на перакрыжаванні вуліц Мінскай і Грахоўскай сабралося каля паўтары тысячы рабочых. Як толькі паявіўся партыйны сцяг, паліцыя накінулася на дэманстрацыю і разагнала яе. Але праз гадзіну ў тым-жа самым месцы зноў сабралося некалькі сот рабочых.

Такія-ж дэманстрацыі адбыліся па вуліцах Акаповай, Дзікай, позна ўвечары—па вуліцы Дзельнай і т.д.

Асабліва баявой была дэманстрацыя 7 лістапада ў Варшаве ў 1934 годзе. У аколіцах Гжыбоўскай плошчы сабралося каля 3 тысяч чалавек. Яны ішлі з песнямі і рэволюцыйнымі лозунгамі па Цвёрдай вуліцы. Калі паліцыя і шпікі прабавалі атакаваць дэманстрацыю, рабочыя, узброіўшыся драўлянымі каламі і дошкамі, моцна пабілі паліцэйскіх і шпікаў.

Затым дэманстранты накіраваліся па напрамку да Банкавай плошчы, а адтуль на вуліцу Бялянскую, каб прабрацца к турме, называемай «Цэнтральняк», дзе сядзелі сотні комуністаў—палітзняволеных. Моцныя атрады паліцыі не дапусцілі дэманстрантаў к турме.

Вельмі часта дэманстрацыі праводзіліся 7 лістапада ўвечары. Цікавая вячэрняя дэманстрацыя адбылася ў 1927 годзе ў Вільні. Віленская арганізацыя КПЗБ заклікала рабочых сабрацца каля вуліцы Савіч. Раптам былі запалены паходні, якія былі прынесены комуністамі, быў разгорнут сцяг, і ўся дэманстрацыя з факеламі ў руках і песнямі рушылася па вуліцы.

Дэманстрацыі адбываліся не толькі ў гарадах, але і ў вёсках. Сяляне Гродненшчыны, Брэстчыны, Скідэльшчыны арганізоўвалі сходы, масоўкі, вывешвалі сцягі і транспаранты. Неаднаразова сяляне прыбывалі ў горад, каб аб'яднацца на сумесныя выступленні з рабочымі. Так было ў 1927 годзе ў Пінску. Быў базарны дзень, у горад прыбыло многа сялян. Група гарадскіх і сельскіх комуністаў сабралася на базары. Хтосьці пачаў іграць на гармоніку. Зараз-жа вакол іграючага сабраліся сотні сялян. Тады выступіў прамоўца, які расказаў аб значэнні 7 лістапада. Быў распрасцёрты чырвоны сцяг, і дэманстранты пайшлі па вуліцах горада. У дэманстрацыі ўдзельнічалі рабочыя пінскай запалкавай фабрыкі.

Але не толькі па вуліцах гарадоў і вёсак, не толькі на прадпрыемствах святкавалі працоўныя гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі. І за турэмнымі кратамі, нават у жудасных умовах канцэнтрацыйнага лагера Картуз-Бярозы палітычныя зняволеныя дэманстравалі сваю адданасць ідэям Леніна — Сталіна, ідэям Кастрычніка.

Перад намі журнал, выданы ў беластоцкай турме к 10-годдзю Кастрычніцкай рэволюцыі пад назвай «Кастрычнік». Палітзняволеныя пішуць:

«У X гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі 350 вязняў польскага фашызма, палітычных зняволеных беластоцкай турмы праз каменныя сцены і жалезныя краты перасылаюць палкае рэволюцыйнае прывітанне соцыялістычнай бацькаўшчыне міжнароднага пролетарыята СССР!»

У Картуз-Бярозе, дзе адзін арыштаваны не меў права гаварыць з другім пад пагрозай зверскіх катаванняў, шэптам адбываліся тайныя гутаркі аб вялікай краіне соцыялізма. Закатаваныя і змучаныя рабочыя і сяляне ведалі, што ніякія катаванні і кары не могуць затрымаць пераможнага ходу ідэй комунізма, ідэй Вялікага Кастрычніка. Яны ведалі, што краіна соцыялізма акажа дапамогу прыгнечаным і зняволеным капіталістамі і памешчыкамі.

— Іх спадзяванні споўніліся. Дзякуючы брацкай дапамозе Совецкага Саюза 13 мільёнаў працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны свабодна святкавалі гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

С. Натансон.

ЗА РАДЗІМУ!

На працягу вякоў царская Расія была дзяржавай адсталай, адсталай у эканамічных, культурных, тэхнічных адносінах. Таму ворагам удавалася наносіць ёй часамі цяжкія паражэнні.

Вялікі наш народ не раз у цяжэйшых умовах доказваў сваю выключную, ні з чым непараўнаную жыццездольнасць. Ён сумеў перамагчы горыч паражэнняў. Ён умеў хутка аднаўляць і свае духоўныя сілы і матэрыяльныя запасы. Наш народ рваўся да свабоды, інстынктам, а затым розумам угадваў, што можна і трэба пакончыць з адсталасцю!... За гэтую-ж адсталасць прыходзілася цяжка расплачвацца.

У Крымскую вайну (1854 — 1855 гг.) рускую армію снарадзілі зброяй, якая аказалася нікуды не годнай. Гладкаствольныя, прымітыўныя ружжы не маглі сасцязацца з англа-французскімі нарэзнымі. Цяжкія англа-французскія гарматы былі ў тры-чатыры разы дальнабойней, чым рускія. Якія-б цуды гераізма і стойкасці ні паказвалі ў тую вайну рускі салдат і матрос, зыход вайны быў ясны. Гэта была безнадзейная барацьба краіны адсталай, у якой пераважалі першабытныя, па выразу Энгельса, спосабы вытворчасці, з нацыямі, узброенымі навейшай тэхнікай.

На руска-японскую вайну 1904—1905 гадоў царская Расія рушылася зноў непадрыхтаванай. Прывяду толькі некаторыя прыклады, якія пакажуць ступень тагочаснай эканамічнай і ваеннай адсталасці.

Сібірская чыгунка не была дабудавана. Войскі і грузы перапраўляліся праз Байкал дапатопным спосабам: хто пешшу, хто гужам... У крэпасных раёнах Далёкага Усхода не было нават плотнікаў. Іх прыходзілася дастаўляць за 10.000 вёрст. Армія не атрымала своечасова ні кулямётаў, ні цяжкіх гармат. Прысылаемыя гарматы былі ў такім тэхнічным становішчы, што выходзілі з строю пасля першых выстралаў. Ні царскі ўрад, ні камандаванне не паклапаціліся вывучыць і абсталяваць манчжурскі тэатр ваенных дзеянняў. Не было карт. Калі трэба было будаваць умацаваныя пазіцыі, не аказвалася надзейных будаўнікоў, якія маглі-б употайку захоўваць дaручаную ім справу. Прыходзілася наймаць выпадковае чужаземнае насельніцтва, сярод якога вораг без цяжкасці вербаваў шпіёнаў...

Чаго-б вы ні крануліся ў гісторыі гэтай няшчаснай вайны, вы зноў і зноў натыкаецеся на адсталасць тагочаснай Расіі, на прадажнасць царскіх міністраў і чыноўнікаў, культывіраваўшых адсталасць. А за адсталасць краіну білі...

Пасля руска-японскай вайны прайшоў дзесятак год. Пачалася вайна 1914—1918 гадоў.

Вось што адбылося ў час першай імперыялістычнай вайны. Ужо пасля першых месяцаў ваенных дзеянняў выявілася, што руская дзейнічаючая армія астаецца без патронаў і снарадаў. Запасы канчаліся. Прамысловыя прадпрыемствы—казённыя і прыватныя — працавалі без вызначанага плана. Вопытных, ведаючых рабочых, майстраў і тэхнікаў натоўпамі заганялі ў запасныя батальёны, дзе яны дурэлі ад муштры, або гналі іх на варожы дрот і кулямёты, дзе яны гінулі. Людзей бралі таксама з заводаў, працаваўшых на абарону. Справа даходзіла да таго, што не хапала часам муляроў, плотнікаў, чорнарабочых.

У снежні 1915 года высвятлілася, што «саюзнікі» (Англія і Францыя), ахвотна ўзяўшы з царскага ўрада каласальную колькасць золата і абавязаўшыся паставіць 4 мільёны 500 тысяч снарадаў, паставілі толькі 500 тысяч. На запросы «саюзнікі» холадна адказвалі: «Астатняе нам трэба самім». Гэта было ўскрыта ў дакладзе дырэктара дэпартамента гандлю і прамысловасці Літвінава-Філінскага. Можна да гэтага дадаць, што за кошт пайшоўшага ў Англію, Францыю і ЗША рускага золата там была абсталявана маса ваенных прадпрыемстваў і праведзена мабілізацыя прамысловасці.

Так бяздарна, тупа і злачынна распараджаўся царскі ўрад народнымі сродкамі. Векавыя ўрокі не пайшлі яму на карысць.

* * *

1917-ы год апавясціў усяму свету аб Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў Расіі, якая прынесла поўнае, зверху данізу, пераўстройства ўсяго нашага народнага быцця.

Рабочы клас і бяднейшае сялянства амаль з першых-жа дзён устанаўлення ўлады советаў натыкнуліся на жорсткае, лютае супраціўленне рускіх і замежных капіталістаў. Іншаземны капітал, які падтрымліваў рускую контррэволюцыю, не хацеў выпускаць Расію з сваіх рук. Ён хацеў па-ранейшаму бачыць яе адсталай, слабай, карыстацца яе грашыма, устрайвацца ў рускай прамысловасці, у банках і канцэсійных прадпрыемствах і выкалачваць звышпрыбыткі.

Замежныя капіталісты смяротна баяліся ўзнікнення Расіі свабоднай, соцыялістычнай, магутнай у эканамічных, культурных і ваенных адносінах. І пачалася доўгая, упорная вайна. Усе памятаюць яе...

Рускі народ і біўшыяся з ім плячом к плячу іншыя брацкія народы нашай краіны паказалі сваю сілу, дысцыпліну, вытрымку. У агні барацьбы нарадзілася і загартавалася Чырвоная Армія, армія герояў. Працоўныя, не лічачыся з часам, аддавалі сваю працу на абарону. Не маючы дастатковага вопыту, людзі ўсё-ж стварылі тэхніку для новай арміі — для Чырвонай Арміі.

У радах працоўнага народа ўсё злівалася ў адзіную волю, у адзіную думку—разбіць, выгнаць ворагаў, якія сціскалі Рэспубліку советаў на **шасці** франтах. Малейшая няўдача на фронце, кожны заклік к тым, хто стаіць ля станка, або на транспарце, ці ў полі, выклікаў новыя нечалавечыя намаганні і энергію. Бывала так, што баі разыгрываліся ўшчыльную ля прамысловых прадпрыемстваў. Так было ў Пітеры, так было ў Луганску, так было ў Царыцыне, ля Тулы... Ды не пералічыць тут усіх гарадоў і заводаў, радам з якімі разыгрываліся баі.

Бывала так, што тыднямі рабочыя не выходзілі з заводаў, з майстэрань і з дэпо. Заклікі Леніна і Сталіна пабуджалі кожнага працаваць з усім напружаннем сіл.

Я прывяду толькі некаторыя прыклады, узяўшы як узор работу піцерскіх пралетарыяў: пуцілаўцаў, іжорцаў і іншых.

У дні, калі Юдзеніч падступаў да Піцера, прадукцыйнасць і інтэнсіўнасць працы на заводах, якія абслугоўвалі абарону, падняліся на 300—400—500 процантаў. Бронепаязды №№ 5, 6 і 45 былі адрамантаваны пуцілаўцамі менш чым у суткі. Устанаўліваліся на бронепляцоўкі не якія-небудзь гарматы, а шасцідзюймовыя марскія. У лафетна-снараднай майстэрні большасць слесараў і токараў заявіла, што пакуль ёсць небяспека для Совецкай рэспублікі, яны будуць працаваць па 12—16 гадзін у суткі. Гэтыя героі-пролетарыі ў некалькі

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Пачотная работа агітатара

Яшчэ задоўга да выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы члены агітацыйнага калектыва абласной канторы Дзяржбанка працавалі сярод насельніцтва. Мы ўжо ведалі сваіх людзей, з якімі вялі агітацыйна-масавую работу, а яны ведалі нас, палюбілі нас. Жыхары Мэблевай вуліцы—дамоў №№ 22, 22/а, 24, 26/а, 25 і 31 былі арганізаваны ў гурток, які складаецца галоўным чынам з домагаспадынь.

Калі пачалася кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, галоўнай тэмай стала раз'ясненне і вывучэнне Палажэння аб выбарах.

У маім гуртку 24 чалавекі. Я паставіла задачу прыцягнуць у гурток усіх выбаршчыкаў маіх дамоў, каб раз'ясніць ім усе пытанні, звязаныя з выбарамі, а таксама расказаць пра міжнародную і ўнутраную абстаноўку Совецкага Саюза, расказаць аб кандыдатах, якія вылучаюцца ў дэпутаты мясцовых Советаў блокам комуністаў і беспартыйных.

Першыя заняткі аб выбарчай кампаніі былі праведзены 23 кастрычніка. Слухачы праяўлялі вялікую актыўнасць і зацікаўленасць, усе былі ў зборы.

На канкрэтных прыкладах і фактах выбараў у капіталістычных краінах я расказала аб ліцамер'і буржуазных заправіл у іх выбарчай палітыцы, аб бяспраў'і працоўных. Разам з тэтым я расказала аб маральна-палітычным адзінстве і маналітнасці совецкага народа, згуртаванасці вакол партыі Леніна—Сталіна ў мінулых выбарах у Вярхоўныя Советы, на якіх перамог блок комуністаў і беспартыйных.

Нарэшце, я падкрэсліла асноўныя задачы выбаршчыкаў у надыходзячых выбарах у мясцовыя Советы, указаўшы, што гэтым завяршаецца перабудова ўсіх органаў дзяржаўнай улады ў заходніх абласцях БССР і Украінскай ССР на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі.

Слухачы гуртка праяўляюць вялікую зацікаўленасць да такіх гутарак. Яны самі выступаюць з цікавымі заявамі. Напрыклад, жонка рабочага-стаханаўца скурзавода Вера Іванаўна Клепацкая гаворыць:

— У былой Польшчы мы не ведалі, за каго галасавалі. Кожная партыя, якіх было тут вельмі многа, падсоўвала сваіх кандыдатаў, а іх агенты ўсімі сродкамі збіралі галасы. І ўсё-ж-такі галасоў было далёка нямнога, бо большасць з нас не давярала гэтым кандыдатам.

Выбаршчыца тав. Ражко гаворыць:

— Буржуазныя дэпутаты былога польскага сейма не адлюстроўвалі інтарэсаў працоўнага народа. Яны ахоўвалі інтарэсы сваіх партый, абаранялі інтарэсы капіталістаў і фабрыкантаў.

Мой гурток расце з кожнымі заняткамі. Выбаршчыкаў асабліва зацікавіла паяўленне брыгады кінохронікі, якая рабіла здымкі ў час нашай гутаркі. Гэта вельмі кранула іх, і яны доўга расказвалі аб гэтым сваім суседзям.

6 лістапада ў кінотэатры «Спартак» у кінохроніцы быў паказан і мой гурток. Потым я арганізавала калектыўны паход сваіх слухачоў у кіно. Іх захапленню не было межаў.

Актыўнасць маіх слухачоў дасягаецца тым, што я кожную гутарку праводжу даступнай мовай. Да кожных заняткаў я прачытваю многа рэкамендуемай літаратуры, падбіраю цікавыя лічбы і факты, складаю падрабязныя канспекты.

Дзякуючы таму, што прыходзіцца чытаць многа літаратуры, сачыць за ўсімі бягучымі падзеямі, значна павышаецца мой уласны палітычны ўзровень і агульны кругагляд. Я адчуваю, што за апошні час работы агітатарам значна вырасла палітычна.

У мінулых выбарах у Вярхоўны Совет СССР і БССР я працавала сакратаром выбарчага ўчастка. Прыходзілася штодзённа мець справу з выбаршчыкамі, а гэта стварыла вялікую зацікаўленасць да работы з людзьмі. І я тарджуся, што зараз мне даверылі вялікую пачотную работу агітатара.

Неабходна адзначыць, што партыйная арганізацыя абласной канторы Дзяржбанка адной з першых разгарнула агітацыйную работу на сваім выбарчым участку і стварыла агіткалектыў з ліку лепшых работнікаў.

Хачу адзначыць кіраўніка агіткалектыва тав. І. Н. Савіна, які аказвае нам, агітатарам, вялікую дапамогу. Тав. Савін за некалькі дзён перад кожнымі заняткамі агітатараў праводзіць з намі семінар, рэкамендуе *літаратуру для кожнай* тэмы, бывае на занятках гурткоў і адзначае нашы недахопы, выпраўляе іх.

О. Скуратовіч,
член агіткалектыва аблканторы Дзяржбанка.



На здымку: актыў горада Гродна за складаннем спіскаў выбаршчыкаў.
Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА.

Кандыдаты Свіслацкага раёна

Працоўныя Свіслацкага раёна на сваіх перадвыбарчых сходах вылучаюць лепшых людзей раёна кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў. 200 чалавек рабочых і служачых свіслацкага скурзавода № 11 на перадвыбарчым сходзе аднадушна вылучылі кандыдатам у абласны Совет намесніка старшыні аблвыканкома Нікалая Іванавіча Грыбаедава. У раённы Совет калектыў завода рашыў паслаць рабочага завода, лепшага стаханаўца Міхаіла Леонцьевіча Перкоўскага.

Сяляне вёскі Вялікія Грынкі ў прысутнасці 140 чалавек вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета лепшую актывістку вёскі Ксеню Касьянаўну Трафімік; настаўніцу Вяліка-Грынкаўскай няпоўнай сярэдняй школы Надзежду Васільеўну Канторыну сход вылучыў кандыдатам у дэпутаты раённага Совета.

Д. Казлоў.

—о—

Нарада кіраўнікоў участковых і акруговых выбарчых камісій Беластока

Днямі ў беластоцкім Доме партыйнай асветы адбылася гарадская нарада старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў участковых і акруговых выбарчых камісій. Старшыня горвыканкома тав. Ражноўскі выступіў на нарадзе з дакладам аб задачах камісій у разгортванні работы па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Растлумачыўшы абавязкі камісій, ён падрабязна спыніўся на тым, як павінны наладзіць і арганізаваць сваю работу камісіі ў акругах і на ўчастках.

Выступаўшыя ў спрэчках тт. Ланцоў, Баліцкая і іншыя адзначылі некаторыя недахопы ў рабоце па падрыхтоўцы да выбараў з боку гарадской выбарчай камісіі і аблвыканкома.

Старшыням многіх участковых і акруговых камісій яшчэ не паведамлена аб тым, хто ўваходзіць у састаў выбарчых камісій. *Не для ўсіх камісій падабраны памяшканні.* Кіраўнікі асобных устаноў недаацэньваюць важнасці выбарчай кампаніі і адмаўляюцца ад неадкладнага прадастаўлення памяшканняў для выбарчых участкаў. Марудна праходзіць паўторная праверка спіскаў выбаршчыкаў.

Няправільным было выступленне старшыні акруговай выбарчай камісіі № 138 тав. Кучына. Той факт, што да апошніх дзён не разгорнута работа ў камісіі, ён спрабаваў «растлумачыць» рознымі неправдападобнымі «прычынамі». Па яго думцы, трэба было паставіць работу ў камісіях так, каб старшыня атрымаў ад горвыканкома ўсё падрыхтаванае. Да яго ў кабінет трэба было прадставіць усіх членаў камісіі, давераных асоб і нават агітатараў. Тады-б ён мог імі кіраваць. Відаць, што некаторыя арганізацыі ўсё-ж неабдумана вылучалі сваіх прадстаўнікоў у камісіі.

Сакратар гаркома КП(б)Б тав. Кузняцоў указаў на неабходнасць неадкладна зрабіць усе камісіі актыўна дзейнічаючымі выбарчымі органамі.

Адкрылася выстаўка „Ленін і Сталін — арганізатары БССР“



Карціна заслужанага дзеяча мастацтваў, ордэнаносца В. В. Волкава «Выступленне Я. М. Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі большэвікоў 23 (10) кастрычніка 1917 года».
Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

НОВАЯ ТВОРЧАЯ ПЕРАМОГА МАСТАКОЎ БССР

(Да адкрыцця выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР»).

Ва ўрачыста радасныя дні XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў Мінску адкрылася выяўленчая выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Гэта выстаўка з'яўляецца дастойнай сустрэчай вялікага свята. Работнікі выяўленчага мастацтва БССР рапартуюць партыі, ураду, вялікаму Сталіну аб сваіх творчых поспехах.

Пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі пышна расцвіла нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу культура ўсіх народаў СССР. Выяўленчае мастацтва ў Беларусі, як адна з састаўных частак нацыянальнай культуры, атрымала пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі нябачаны размах. Толькі за апошнія два годы ў нашай рэспубліцы створаны: дзяржаўная карцінная галярэя ў Мінску, карцінная галярэя імені народнага мастака БССР Ю. М. Пэна ў Віцебску, мастацкае вучылішча ў Беластоку.

Мастакі нашай рэспублікі на працягу двух з лішкам год натхнёна рыхтаваліся да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Акружаныя клопатамі партыі і ўрада, яны з вялікім энтузіязмам выконвалі ўзятае на сябе абавязацельства — **у мастацкай форме адлюстраваць гераічнае мінулае і шчаслівае сучаснае беларускага народа, які ў саюзе з усімі народамі нашай вялікай радзімы будуе сваё новае жыццё; адлюстраваць вялікіх геніяў чалавецтва — Леніна і Сталіна, як тварцоў гэтага новага жыцця.**

На выстаўцы прадстаўлена каля 900 экспанатаў розных галін выяўленчага мастацтва.

Самая тэма выстаўкі ідэйна і творча натхняла нашых мастакоў у іх напружанай рабоце. Вобразы геніяў рэволюцыі запечатлены ў такіх манументальных работах, як скульптурная група «Ленін і Сталін», аўтарам якой з'яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў ордэнаносец З. І. Азгур, «Ленін на трыбуне» — заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца А. В. Грубэ, «Сталін у Рэўваенсовеце Заходняга фронта» — два вялікіх палотны работы жывапісцаў — ордэнаносца Н. А. Пашкевіча і маладога мастака Е. Е. Красоўскага.

Наша шчаслівае жыццё адлюстравана ў першым беларускім гобелене, над якім працавала 20 лепшых вышывальшчыц рэспублікі. Гобелен гэты на тэму «Лявоніха» зроблен па эскізах заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца В. В. Волкава і мастака О. П. Марыкса.

Упершыню на выстаўцы выступаюць з самастойнымі цэльнымі творамі маладыя мастакі. Без пераўвелічэння можна сказаць, што іменна падрыхтоўчая работа да выстаўкі падняла і выхавала цэлую пляяду моладзі. Таленавіты малады жывапісец Касмачоў прадстаўлен на выстаўцы цікавым па каларыту і кампазіцыі палатном на тэму «У падпольнай друкарні Мінскага большэвіцкага камітэта». Мастак Гаўрыленка па-майстэрску перадаў незабыўны гістарычны эпізод раззбраення карнілаўскіх эшалонаў у Гомелі, якое адбывалася пад кіраўніцтвам Л. М. Кагановіча. Комсамолец Анжруховіч даў вельмі вобразную па жывапісі карціну «Арышт большэвіцкага агітатара». Тэме аб узброенай барацьбе беларускага народа з белапольскімі акупантамі прысвяціў сваю першую вялікую работу комсамолец Бажэўскі. Карціна комсамольца А. Кроля расказвае пра забастоўку мінскіх грузчыкаў у час белапольскай акупацыі.

Вялікім перамогам у гераічнай барацьбе беларускага народа супроць польскіх паноў і памешчыкаў за сваё вызваленне прысвечаны два вялікіх творы маладых майстраў— ордэнаносцаў Зайцава («Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 г.») і Манасзона («Сустрэча танкістаў з насельніцтвам Заходняй Беларусі»).

Выстаўка паказвае перамогі натхнёнай і творчай працы работнікаў выяўленчага мастацтва рэспублікі і з'яўляецца значным этапам у падрыхтоўцы да Ўсесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма».

Старшыня Саюза совецкіх мастакоў БССР
ордэнаносец
І. Рубінштэйн.

Адкрыццё выстаўкі

8 лістапада ў Мінску, у памяшканні карціннай галярэі, адкрылася Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

На адкрыццё выстаўкі сабраліся прадстаўнікі грамадскасці Мінска— стаханаўцы прадпрыемстваў, байцы, камандзіры і палітработнікі Мінскага гарнізона, мастакі, пісьменнікі, артысты, кампазітары. Сярод гасцей—сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка і Малін, тт. Наталевіч, Эйдзінаў, Цанава, Ванееў, Гласаў, Янка Купала, Змітрок Бядуля, дэлегацыя працоўных Літоўскай ССР, а таксама група выдатных мастакоў Масквы і Кіева.

Выстаўку па даручэнню ЦК КП(б)Б і СНК БССР адкрывае намеснік Старшыні СНК БССР тав. Ванееў.

Слова прадастаўляецца намесніку старшыні оргкамітэта Саюза совецкіх мастакоў СССР, заслужанаму дзеячу мастацтваў М. Г. Манізеру. Тав. Манізер гаворыць аб тым, што адкрыццё выстаўкі з'яўляецца вялікім святам беларускага народа.

Ад імені Саюза совецкіх мастакоў Масквы майстраў мастацтваў Совецкай Беларусі горача вітае заслужаны дзеяч мастацтваў Сергей Герасімаў. Затым слова для прывітання прадстаўляецца заслужанаму дзеячу мастацтваў прафесару жывапісу Фёдару Крычэўскаму. Ад імені мастакоў брацкай Украінскай ССР ён горача віншуе мастакоў і ўсіх працоўных Беларускай ССР з адкрыццём выдатнай выстаўкі.

Тав. Ванееў пераразае чырвоную істужку, і прасторныя залы выстаўкі напаўняюцца наведвальнікамі. (БЕЛТА).

—о—

УРАДАВЫ ПРЫЁМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ВЫСТАЎКІ

9 лістапада адбыўся ўрадавы прыём удзельнікаў Усебеларускай выстаўкі выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Прысутнічалі члены ЦК КП(б)Б і ўрада БССР, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Вярхоўнага Совета БССР, народныя камісары, камандзіры і палітработнікі Мінскага гарнізона, артысты, прадстаўнікі друку. Сярод прысутных тт. Панамарэнка, Малін, Ванееў, М. Захараў, Цанава, Озірскі, старшыня оргкамітэта Саюза совецкіх мастакоў СССР А. М. Герасімаў, намеснікі старшыні оргкамітэта тт. Манізер і Ражскі, маскоўскія мастакі Маор, С. Герасімаў, Шэгаль, Крылоў, Мадораў, украінскія мастакі Ткачэнка і Крычэўскі, беларускія мастакі ордэнаносцы тт. Керзін, Волкаў, Грубэ, Азгур, Пашкевіч, Зайцаў, Манасзон, Алтуф'еў, народны паэт БССР Якуб Колас, пісьменнік М. Лынькоў і інш.

Намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Ванееў пад бурную авацыю прысутных праўзгалашае тост за натхніцеля і арганізатара найвялікшых перамог соцыялізма— правадыра народаў вялікага Сталіна.

Майстар кісці Аляксандр Міхайлавіч Герасімаў вітае мастакоў БССР і праўзгалашае тост за іх выдатныя творчыя поспехі.

З прывітальнымі прамовамі выступілі таксама мастакі брацкай Украінскай ССР тт. Ткачэнка і Крычэўскі.

У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт. (БЕЛТА).

дзён стварылі для Чырвонай Арміі совецкія браняваныя аўтамабілі-скрозьходы «Осцін», якія маглі дзейнічаць, як танкі.

Працавалі ў тыя дні натхнёна. Кожную гадзіну на Пуцілаўскім, Іжорскім і іншых заводах атрымоўваліся ўсё новыя запросы на бронепаязды, браневікі, гарматы і снарады: «Давай хутчэй!..» Адну за другой выпускалі іжорцы кулямётныя вежы, бранелісты для аўтамабіляў, гільзы. Сестрарэцкі аружэйны завод, выдзеліўшы многа людзей на фронт, усё-ж павысіў прадукцыйнасць, даючы новыя сотні адрамантаваных вінтовак. Швейнікі ўзнялі прадукцыйнасць працы на 500 процантаў і выпускалі 7 тысяч шынеляў у дзень...

Краіна советаў перамагла ворагаў. Уладзімір Ільіч Ленін указваў: «Мы перамаглі таму, што лепшыя людзі ўсяго рабочага класа і сялянства праявілі нябачаны гераізм у гэтай вайне з эксплаатататарамі, стваралі цуды храбрасці, пераносілі нечуваныя нястачы афяравалі сабой, выганялі бязлітасна шкурнікаў і трусоў» (т. XXX, стар. 402).

* * *

Пасля заканчэння вялікай вызваленчай грамадзянскай вайны прайшло два дзесяцігоддзі. Наш народ не патраціў іх дарэмна. У мінулым адсталая і слабая, краіна воляй большэвікоў стала магутнай, непераможнай соцыялістычнай дзяржавай. Народ адчуў яшчэ глыбей, што ў яго ёсць **бацькаўшчына** і што адстойваць яе незалежнасць—першы свяшчэнны доўг кожнага з нас і ўсіх разам.

Год за годам усё глыбей у народ унядраюцца соцыялістычныя, патрыятычныя ідэі.

Прадаўжаючы і паскараючы вялікія будаўнічыя работы, наш народ не забывае аб небяспецы.

Мы бачым, што нас акружае, бачым варожы капіталістычны свет і ведаем, як з ім трэба размаўляць.

У капіталізма воўчыя законы. Калі ты адстаў, калі ты слабы, цябе будуць біць, прыгнятаць, заняволіваць. Калі ты моцны, магутны, цябе будуць баяцца.

Мы не гублялі час дарма. Справы сталінскіх пяцігодак ведаюць усе, ад малога да вялікага. Мы выйшлі на першае месца ў Еўропе па аб'ёму прамысловай прадукцыі. Зараз мы ажыццяўляем сваю трэцюю пяцігодку. У нас ясная мэта: **мы павінны выйсці на першае месца ў свеце ў эканамічных адносінах;** мы павінны таксама стварыць такую абарону, каб **у выпадку вайны мы маглі-б справіцца з любым ворагам, з любой групіроўкай ворагаў!**

Вопыту, навыкаў, ведаў у нас год ад году ўсё больш. Вырашчаны мільёны кваліфікаваных рабочых, майстраў, тэхнікаў, інжынераў. Вырашчана свая многамільённая соцыялістычная інтэлігенцыя. Калгаснае сялянства вылучыла такіх майстраў сельскагаспадарчай практыкі і навукі, якія паказваюць сусветныя ўзоры, пабіваючы рэкорды Амерыкі і іншых краін.

Гераічны парыў у нашым народзе невычарпальны. Старэйшае пакаленне перадае яго маладому, і абодва разам накіроўваюцца ўперад. Будаўніцтва Вялікага Ферганскага канала — вось адзін з прыкладаў працоўнага пафасу. Пракладка вялікага Памірскага тракта па карнізах гор на «Даху свету»—ці гэта не подвіг?! Пракладка новых чыгунак у Сібіры— ці гэта не подвіг?!

У яшчэ большых маштабах, чым у першую і другую пяцігодкі, ідуць зараз па ўсёй краіне будаўнічыя работы. На Далёкім Усходзе ўзнікае гіганцкі Бурэйбуд, які дасць вугаль усяму Далёкаму Усходу. Ускрываюцца ў радзе месц багацейшыя пласты каштоўных руд. Ствараецца «Другое Баку». Урал абагачаецца новымі буйнымі металургічнымі заводамі. Крывароскі басейн і Данецкі басейн, уступіўшы ў спаборніцтва, сталі прыкметна павышаць здабычу. Новыя метады працы, прапануемыя такімі перадавымі рабочымі, стаханаўцамі, як Аляксей Семіволас, узмацняюць рэсурсы нашай радзімы. Акадэмікі, прафесары робяць новыя адкрыцці, умацоўваючы магутнасць краіны, яе абарону.

Свядома і дружна перайшоў наш гераічны рабочы клас да 8-мі гадзіннага рабочага дня і 7-дзённага рабочага тыдня. Агульным лозунгам становіцца: **прадукцыйна працаваць усе 480 мінут рабочага часу, больш самалётаў, танкаў, гармат, караблёў, больш прадукцыі ўсіх галін народнай гаспадаркі!**

Свядома і планамерна рыхтуем мы вопытныя прамысловыя і транспартныя кадры. Указ аб штогадовым прызыве 800 тысяч — 1 мільёна маладых людзей у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы, у школы фабрычна-заводскага абучэння— новы важны шаг у справе ўмацавання магутнасці нашай краіны. Планамерна, у дзяржаўным парадку, размяркоўвае краіна свае інжынерна-тэхнічныя і рабочыя кадры.

Ураджай зернавых культур у гэтым годзе блізкі да рэкордных паказальнікаў высокаўраджайнага 1937 года. Хлебныя запасы краіны, такім чынам, павысіліся. Буйны скачок мы назіраем у галіне жывёлагадоўлі. У калгасах прыбавіліся новыя дзесяткі тысяч жывёлагадоўчых ферм, прыбавіліся мільёны галоў жывёлы. І гэта таксама ўзмацняе нашу абаронную магутнасць.

23-ю гадавіну нашай Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі СССР сустракае з насельніцтвам амаль у 200 мільёнаў грамадзян. Вырасла насельніцтва нашага Саюза, рассунуліся яго межы. Усё мацнейшай робіцца соцыялістычная дзяржава— надзея працоўных усяго свету.

А капіталістычны свет між тым —у агні і полымі новай жорсткай схваткі за перадзел зямель, калоній і багаццяў. Народы загнаны там у сырыя, халодныя падвалы— «сховішчы», дзе мільёны людзей кожную ноч у трывожнай бяссонніцы чакаюць узрываў цяжкіх бомб. У еўрапейскіх гарадах—цемра, усё змяншаючыйся паёк, насоўваючыяся зімовыя халады і першыя ўспышкі эпідэмічных захворванняў... На капіталістычных заводах—прымусовая праца ў 12, 14, 16 гадзін у дзень. На морах пагібель соцень параходаў і ваенных караблёў, тысяч чалавечых жыццяў.

Імперыялістычная вайна пагражае пераўтварыцца ў сусветную.

Міжнародная абстаноўка накаленая заблытаная, складаная. Яна пагражае ўсякімі нечаканасцямі. Павялічылася ваенная небяспека і для нашай краіны.

Што-ж, мы трымаем народ у мабілізацыйнай гатоўнасці! Нікому не будзе дазволена пасягнуць на свяшчэнныя рубяжы соцыялістычнай дзяржавы. А калі вораг сунецца, вось тады мы рушым у адказ усю накопленую гадамі магутнасць!.. Выкаванае рукамі рабочага класа СССР аружжа вырашыць спрэчкі. Мы здолелі перамагчы ў 1917 — 1921 годах. Мы пераможам і ў будучых баях.

Всевалад Вішнеўскі,
пісьменнік-ордэнаносец.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора ў другой палове дня некалькі адзінкавых германскіх самалётаў зрабілі налёт на раён Лондана, а таксама на некаторыя ўнутраныя графствы Англіі і скінулі невялікую колькасць бомб. Бамбардыроўка прычыніла нязначны матэрыяльны ўрон. Чалавечыя афяры невялікія.

Указваецца, што налёт германскай авіяцыі, які меў месца ў ноч на 12 лістапада, з'яўляўся адным з найбольш скорасных начных налётаў на Лондан ад пачатку масавых аперацый германскай авіяцыі супроць Англіі.

У ноч на 11 лістапада англійскія самалёты бамбардыравалі шматлікія аб'екты праціўніка, у тым ліку нафтазаводы ў Гельзенкірхене, Рэйнскай області і Брэмене, прадпрыемствы ў Эсене (заводы Крупа), Мангейме, Амстэрдаме і Дрэздэне. Акрамя таго, англійскія самалёты скінулі бомбы на марскія порты Лорыян, Шэрбург, Гаўр, Дзюнкерк, Флісінген і чыгуначныя вузлы ў Дэсау, Мюнстэры, Мангейме і Дрэздэне, а таксама на 14 аэрадромаў у Германіі і на акупіраваннай ёю тэрыторыі.

У час дзённых аперацый 10 лістапада англійскія самалёты атакавалі судны ў Булоні і Кале. З усіх гэтых аперацый не вярнулася 5 англійскіх самалётаў.

Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 10 лістапада англійскія самалёты бамбардыравалі докі ў Санты-Кваранта, якія былі сур'ёзна пашкоджаны. Паспяховы налёт зроблен таксама на Коніспаліс, дзе падвергліся бамбардыроўцы дамба і камунікацыя. Усе англійскія самалёты шчасліва вярнуліся на сваю базу.

АПЕРАЦЫІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 11 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў ноч на 11 лістапада англійская бамбардыровачная авіяцыя зрабіла налёты на Цэнтральную Германію. Поўных звестак аб гэтых аперацыях англійскіх самалётаў яшчэ няма. Згодна афіцыяльнай заяве, зроблены налёты на розныя пункты, у тым ліку на Мангейм, Эсен, Гельзенкірхен і Данцыг, дзе бамбардыроўцы падвергліся чыгуначныя шляхі.

БЕРЛІН, 11 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што ў ноч на 11 лістапада некалькі англійскіх самалётаў прабавалі зрабіць налёт на сталіцу Германіі. Дзеянні супроцьпаветранай абароны прымусілі непрыяцельскія самалёты павярнуць назад, раней чым яны змаглі скінуць бомбы.

Шведская газета аб якасці англійскіх бамбардыровачных прыцэлаў

СТАКГОЛЬМ, 11 лістапада. (ТАСС). 6 лістапада газета «Нюа дагліґт Аллеханда» апублікавала чарговы артыкул свайго карэспандэнта, прымаўшага ўдзел у паездцы шведскіх журналістаў па Германіі. Артыкул прысвечан англійскім бамбардыроўкам.

«Эксперты адзначаюць, — піша газета, — што збітыя ў Германіі англійскія машыны падвергліся дэталёваму абследванню, якое паказала, што матэрыялы, з якіх зроблены самалёты, першакласныя, канструкцыі самалётаў выдатныя, усе дэталі машыны стаяць на вышыні сучаснай тэхнікі, акрамя бамбардыровачнага прыцэла. На англійскіх самалётах прыцэлы надзвычайна прымітыўнай канструкцыі. Англійскія прыцэлы канструіраваны без уліку хуткасці самалёта і ўмоў ветру. Германская авіяцыя мае ў гэтых адносінах вялікую перавагу. Агляд збітых англійскіх самалётаў дае ўяўленне і аб некаторых іншых дэталях. Карты і фатаграфіі, якія знаходзяцца ў распараджэнні англійскіх лётчыкаў, сведчаць аб першакласным шпіянажы. Англійскія лётчыкі зусім дакладна ведаюць, дзе знаходзяцца германскія газасховішчы, электрастанцыі і прамысловыя прадпрыемствы. Я сустрэў аднойчы аднаго германскага прамыслоўца, які расказаў мне, што нядаўна была здана ў эксплаатацыю новая фабрыка боепрыпасаў у Заходняй Германіі. Будаўніцтва вялося ў найвялікшай тайне. Фабрыка была ўзорна замаскіравана. Як і ўсе сучасныя германскія прамысловыя прадпрыемствы, яна не мела фабрычнай трубы, якая-б магла паслужыць арыентырам для лётчыкаў. Дах фабрычнага памяшкання быў афарбован славутай ахоўнай афарбоўкай, якая робіць немагчымым выяўленне афарбаванага прадмета з вышыні 3 тысяч метраў нават у самае яснае надвор'е. Фабрыка была пабудавана ў лесе. Але ўжо праз тры гадзіны пасля таго, як загучэлі машыны і станкі, паявіліся англійскія лётчыкі, падверглі фабрыку бамбардыроўцы і прамахнуліся, не папаўшы ў цэль».

Ваенныя дзеянні ў Грэцыі

БЕЛГРАД, 11 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Врэме» паведамляе з Любоіна (на югаслаўска-албана-грэчаскай граніцы):

«10 лістапада на ўчастку фронта Біглiста-Капішцэ — Крысталопігі было спакойна. Не было чутна ні гарматнай стральяніны, ні шуму матораў самалётаў. Каля 10 гадзін у раёне возера Прэспа італьянцы адкрылі па грэчаскіх пазіцыях артылерыйскі агонь, які быў неўзабаве спынен. Абодва бакі знаходзяцца на пазіцыях, занятых імі 3 дні назад. Вось ужо другі дзень, як на гэтым фронце назіраецца зацішша. Італьянцы ўзмоцнена рыхтуюцца да наступлення. У сувязі з гэтым яны сканцэнтрыравалі значныя сілы ў сяле Пышніцы. Канцэнтрацыя грэчаскіх войск звязана з вялікімі цяжкасцямі. На працягу мінулага тыдня італьянскія самалёты падвяргалі бамбардыроўцы дарогу Фларына — Корча, а грэкі могуць перавазіць падмацаванні на свае пазіцыі толькі па гэтай дарозе. Грэкі ведаюць, што італьянскія самалёты бесперапынна кантраліруюць гэты шлях. Грэчаскія войскі, якія знаходзяцца на возеры Прэспа, змогуць дзейнічаць толькі ў тым выпадку, калі атрымаюць падмацаванне».

Землетрасенне ў Карпатах

Падземныя штуршкі адчуваліся ў Румыніі, Венгрыі, Балгарыі, Югаславіі, Турцыі і Марселі

НЬЮ-ЙОРК, 11 лістапада. (ТАСС). Як перадае бухарэсцкі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, румынскі сейсмалагічны інстытут паведаміў учора, што землетрасенне пачалося ў 3 гадзіны 39 мінут па Грынвічу і прадаўжалася на працягу 3-х мінут. Эпіцэнтр землетрасення знаходзіўся каля Фокшані. Сіла землетрасення даходзіла да 9 балаў. З Фокшані не паступіла ніякіх звестак. Апасаюцца, што там налічваецца многа афяр. Па неафіцыяльных даных, урон, прычынены землетрасеннем, ацэньваецца ў 10 мільёнаў долараў. На многіх нафтавых участках у Плаешці ўзніклі пажары. Сувязь з Бузау, які з'яўляецца самым паўночным горадам, закранутым землетрасеннем, перарвана. У Бухарэсце пасля чатырохгадзіннага перапынку тэлефонная сувязь была часткова адноўлена. Нафтаперагонныя заводы кампаніі «Эрд» закрыты на адзін тыдзень. Будынкі нафтавай кампаніі «Сцяўа» разбураны. Нафтавы цэнтр Кампіна атрымаў вялікія пашкоджанні.

БЕРЛІН, 11 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Будапешта, што моцнае землетрасенне адчувалася таксама і ў Венгрыі. Сейсмічныя станцыі адзначылі землетрасенне нават у Будапешце. Ва ўсходняй частцы Трансільваніі землетрасенне адбывалася ад 7 гадзін 40 мінут да 7 гадзін 45 мінут і дасягнула 7 балаў. Паводле атрыманых тут звестак, будынкі моцна пацярпелі. Звестак аб чалавечых афярах пакуль няма.

САФІЯ, 11 лістапада. (ТАСС). Паводле даных балгарскага друку, учарашняе землетрасенне адчувалася на ўсёй тэрыторыі Балгарыі. Асабліва моцна яно адчувалася ў раёнах Паўночнай Балгарыі. Ва ўсіх населеных пунктах гэтых раёнаў ёсць разбураныя будынкі. Найбольш моцна пацярпела ад землетрасення Нікапольская аколія (раён).

БЕЛГРАД, 11 лістапада. (ТАСС). Як паведамляюць сённяшнія газеты, учарашняе землетрасенне адчувалася на тэрыторыі ўсёй Югаславіі. У Белградзе ваганні глебы працягваліся дзве мінуты, аднак разбурэнняў і афяр не было. У горадзе Заечар у гарадской бальніцы разбурана столь. У Бела-Царкве ў рэзультаце землетрасення пашкоджана некалькі дамоў. У Пажаравацэ на некалькіх дамах разваліліся цагляныя коміны. У горадзе Алесінацы разбурана некалькі дамоў, жыхары якіх правялі ноч на вуліцы пад даждлжом. У Ягодзіне землетрасенне адчувалася вельмі моцна, але пашкоджанняў не было. У гарадах Кральева, Ніш, Пракупле, Вранье, Нові Пазар і радзе іншых месц таксама адчувалася ваганне глебы. У горадзе Сараева сапсаваны сейсмалагічныя апараты.

—о—

РАЗЛІЎ РЭК У ЕЎРАПЕЙСКАЙ ТУРЦЫІ

СТАМБУЛ, 11 лістапада. (ТАСС). Газета «Джумхурыет» паведамляе, што ў рэзультаце моцных дажджоў рэкі Тунджа, Арда, Марыца, Эргене выйшлі з берагоў. Вада паднялася на 430 сантыметраў. Нізіна паміж Караатачам і Алпулу пакрыта вадой.



Стаханаўская брыгада ўпакоўшчыц гродненскай табачнай фабрыкі, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, выконвае норму на 150 процантаў.

На здымку (злева направа): Б. А. Кофман, Б. М. Кушнер, Г. І. Паес.

Фота А. Сапіра.

Шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва

Выканалі ўзятыя абавязацельствы

Працоўныя Ломжынскага раёна з чэсцю выконваюць свае абавязацельствы, узятыя імі ў перадкастрычніцкім соцыялістычным спаборніцтве. Рабочыя завода сельскагаспадарчых машын выканалі вытворчы план на 141 процант. Калі за верасень было сабрана конных прыводаў 96, то ў кастрычніку іх сабралі 127. Шыроказахватных малатарань сабрана ў верасні 12, а ў кастрычніку 18.

Перадавыя людзі завода—стаханаўцы, якія паказваюць узоры працы, сістэматычна выконваюць план на 250 і больш процантаў. Ліцейшчык завода сельскагаспадарчых машын Леон Напюркоўскі выконвае штодзённа сваю норму на 250—280 процантаў. Тав. Напюркоўскі таксама і актыўны грамадскі работнік: ён з'яўляецца старшынёй акруговай выбарчай камісіі і старшынёй заводскага камітэта.

Вялікіх поспехаў дабіліся і калектывы іншых прадпрыемстваў. Рабочыя ватнай фабрыкі абавязаліся ў перадкастрычніцкія дні штомесячна выпрацоўваць 30 тон ваты замест 25 тон па плану, а зараз яны даюць па 1.200—1.300 кг. у дзень. Змена майстра тав. Жукоўскага штодзённа выконвае норму на 141 процант. Стаханаўская брыгада па ўпакоўцы ваты, дзе брыгадзірам з'яўляецца тав. Альшэўчык, упакоўвае ў дзень 1060 кілаграмаў ваты замест 400 кілаграмаў па плану.

На цагельным заводзе № 4 з 1-га па 15-е красавіка было выпрацавана 384 тысячы штук цэглы, а з 15 па 31 кастрычніка — 455 тысяч штук. Стаханавец тав. Цішка за гэтыя дні выканаў норму на 166 процантаў. Стаханавец тав. Вішнеўскі дае 145—150 процантаў дзённай нормы.

Не меншую актыўнасць праяўляюць і сяляне. Пасля абмеркавання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах, сяляне вёсак Хмялеўскага сельсовета абавязаліся да 1-га лістапада поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па ўсіх відах дзяржаўных паставак і грашовых плацяжоў. Гэтае абавязацельства выканана ў тэрмін.

Такімі поспехамі сустракаюць працоўныя Ломжынскага раёна дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

П. Грышчанка.

Выканалі гадавы план

Разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва сярод рабочых, беластоцкі 13-ы тэкстыльны камбінат выканаў гадавую вытворчую праграму, даўшы краіне 844.412,8 метраў гатовых тканін. Па пражы гадавы план выканан на 103,8 процанта.

Калектыў узяў на сябе абавязацельства к канцу года даць звыш плана 175 тысяч метраў тканін.

* * *

Калектыў Беластоцкага міжабласнога аддзялення «Вторцветметал» узяў на сябе абавязацельства да 7 лістапада загатовіць 100 тон лому каляровых металаў. Загатоўлена і адгружана 113,8 тоны, або 113,8 процанта. План за кастрычнік выканан на 130,9 процанта.

ЧАМУ ЗРЫВАЕЦЦА РАДЫЁПЕРАДАЧА?

ЛОМЖА. (**Ад нашага карэспандэнта**).—Радыё служыць велізарным сродкам масавай агітацыі, яно садзейнічае развіццю палітычнай свядомасці і падняццю агульнакультурнага ўзроўню працоўных мас. Асабліва зараз у перыяд выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных радыё набывае вялікае значэнне.

Ля адзінага рэпрадуктара г. Ломжы штодзённа збіраюцца натоўпы людзей. З вялікай увагай яны слухаюць апошнія паведамленні.

Ломжынскім горвыканкомам у плане рэканструкцыі і адноўлення горада на 1940 год намячалася ў кастрычніку поўнасцю радыёфіцыраваць горад і раён.

Па віне-ж Ломжынскай і абласной кантор сувязі, а таксама гаракіраўнікоў Бандарэнка і Акорачкава, якія не паклапаціліся даставіць апаратуру, сарвана радыёфікацыя горада і раёна.

П. ПАЎЛАЎ.

Шырока разгортваецца санітарна-абаронная работа

З кожным днём усё шырэй разгортваецца работа таварыства Чырвонага Крыжа горада Ломжы. На прадпрыемствах, ва ўстановах арганізаваны гурткі, у якіх рабочыя і служачыя вывучаюць санітарна-абаронную справу.

22 кастрычніка ў шавецкай арцелі здалі нормы на значок «ГСА» («Гатоў да санітарнай абароны») першай ступені 15 чалавек. Пасля здачы многія работнікі выказалі жаданне вучыцца далей і здаць абавязкова ўсе нормы на значок «ГСА» другой ступені.

Нядаўна у 2-й гарадской бальніцы нормы на значок «ГСА» здалі 25 чалавек, з іх 15 — на «выдатна», 10—на «добра». Усе яны пераключыліся на здачу норм другой ступені.

Рыхтуецца да здачы норм рад іншых прадпрыемстваў, устаноў, школ горада. У 2-й школе, напрыклад, ужо існуе пярвічная арганізацыя Чырвонага Крыжа. Членамі таварыства з'яўляюцца вучні 16-гадовага ўзросту. Яны актыўна праводзяць агітацыйна-масавую работу сярод астатніх вучняў. Гэта арганізацыя па праву лічыцца перадавой у пастаноўцы арганізацыйна-масавай работы. Іх вопыт заслугоўвае ўсеагульнага падтрымання.

Прадпрыемствы і ўстановы горада павінны яшчэ актыўней узяцца за масавае абучэнне рабочых, служачых, школьнікаў санітарна-абароннай справе і выправіць на хаду маючыяся яшчэ недахопы.

М. Корбут,
старшыня Ломжынскага таварыства Чырвонага Крыжа.

—о—

Паход у процівагазах

Гарадскі совет Асоавіяхіма днямі правёў масавы паход у процівагазах на дыстанцыі 5 кіламетраў. У паходзе прынялі ўдзел рабочыя, інтэлігенцыя і вучні гор. Беластока. Сярод удзельнікаў паходу— студэнты беластоцкага педвучылішча і рабфака, якія арганізавана з'явіліся на месца збору на чале са сваім кіраўніком тав. Астапенка.

Дзякуючы старанай падрыхтоўцы, студэнты закончылі паход на «выдатна». Па сканчэнні паходу яны выказалі жаданне яшчэ глыбей вывучаць абаронную справу і ўдзельнічаць ва ўсіх будучых паходах.

В. Пятроўскі,
М. Муркес,
студэнты Беластоцкага рабфака.

—о—

Экзамен па тэхмінімуму

У штопальнай групе 2-га тонкасуконнага камбіната праведзен экзамен работніц, якія закончылі вучобу па тэхмінімуму.

З 11 чалавек, якія здавалі іспыты, 6 здалі на «выдатна». Сярод іх работніцы Тарэцкая, Міцкевіч і іншыя.

Выкладчык тав. Котаў добра і рэгулярна праводзіў заняткі. Зараз ён рыхтуе яшчэ 2 групы да здачы іспытаў. Усяго ў бліжэйшыя дні заканчваюць тэхмінімум 4 групы.

Раткевіч.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА № 33

ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА
ад 23 кастрычніка 1940 года.
Аб падрыхтоўцы да зімы вадаправодных і каналізацыйных уводаў.

Нясвоечасовая і недастатковая падрыхтоўка дамавых уводаў да зімы 1939 г. прывяла да масавага размаражванню трубаправодаў і прылад у кватэрах і дамах, у выніку чаго атрымоўваліся вялікія ўцечкі і насельніцтва аставалася без вады. У сувязі з гэтым Беластоцкі гарадскі выканаўчы камітэт пастанаўляе:

1. Абавязаць усіх водаспажыўцоў гарадскога вадаправода і каналізацыі гор. Беластока правесці да 15 лістапада 1940 г. наступныя мерапрыемствы:

а) ацяпліць вадамеры і шахты;

б) Адкачаць ваду з калодзежаў, дзе ўстаноўлены вадамеры, ушчыльніць і забетаніраваць асновы калодзежаў, дзе выступае вада;

в) устанавіць у калодзежах лесніцы для свабоднага доступу да вадамераў;

г) зашкліць і абаграваць усе бытавыя памяшканні, дзе праходзяць вадаправодна-каналізацыйныя трубаправады і дзе ёсць арматура;

д) у выпадку невыканання водаспажыўцамі да ўказанага тэрміну намечаных мерапрыемстваў вінаватых адключаць ад вадаправоднай сеткі.

Кантроль за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на Водаканалтрэст.

Старшыня Беластоцкага горвыканкома
І. РАЖНОЎСКІ.

Сакратар Беластоцкага горвыканкома
Ф. ОКУНЬ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—92. Тыраж — 10.000 экз. Друкарня Беластокдрук